Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА

ГПБ Ср. Аз.

№ 10
КРАСАВІК

БУДУЕМ ТРАКТАР

На пабудову трактара імя „Беларуская Работніца і Сялянка“ ў падарунак калгасу ўносіць:

1. Менская арцель панчошніц . . 40 руб.
2. Сялянкі вёскі Ляскі . . . . 4 „ 85 кап.
3. Дэлегаткі Старобіну . . . . 8 „ 16 кап.
4. З калгасу „Індустрыя“, Віцебскай акр. . . . . 19 „ 33 „
5. Навуковыя працаўнікі Горацкай сельска-гаспадарчай акадэміі, студэнты, гэтай-жа акадэміі, жонкі супрацоўнікаў і хатнія работніцы . . . 40 руб.

Грошы сабраны па ініцыятыве жонкі трактарыста-Хвядоры—Хвабрыставай.

Работніцы, калгасьніцы, грамадчыцы, дэлегаткі актывісткі, сялькоркі і ўсе чытачкі часопісі, арганізуйце зборы на трактар імя „Беларускай Работніцы і Сялянкі“ ў падарунак калгасу.

ЧЫТАЧКІ АБ ЧАСОПІСІ

Вітаюць сваю часопісь

Раённы зьезд калгасьніц Барысаўскага раёну, шле сваё шчырае прывітаньне часопісі „Беларуская Работніца і Сялянка“.

Раённы зьезд калгасьніц адзначае, што значна выросла актыўнасьць працоўных жанчын, як ніколі ўцягваюцца жанчыны ў грамадзкае жыцьцё.

Шмат ужо маецца такіх, хто актыўна дапамагае будаваць гаспадарку калгасу, хто дае добры адпор клясавым ворагам, стараючымся падарваць калгаснае будаўніцтва.

Гэтыя дасягненьні мы маем дзякуючы працы сярод працоўных жанчын, якая была праведзена партыяй.

Часопісь „Беларуская Работніца і Сялянка“ таксама адыграла вялікую ролю ў справе выхаваньня працоўных жанчын. Часопісь дапамагае ўсьвядоміць нашы задачы ў сацыялістычным будаўніцтве.

Абяцаем больш чытаць і пісаць у нашу часопісь пра наша жыцьцё і працу.

Бярэм на сябе абавязак выпісаць ня менш 2.500 экзэмпляраў часопісі.

Хай жыве наш кіраўнік—Камуністычная партыя!

Хай жыве часопісь „Беларуская Работніца і Сялянка“!

Прэзыдыум канфэрэнцыі.

Барысаў.

На вокладды—закройшчыца ф-кі Меншвэй у Менску.

ВЫКЛІКАЕМ.

Правядзеньне трохмесячніка Беларускай культуры, знайшло належны водгук у нашай піонэр - арганізацыі. Піонэратрад пры Д. П. У. пастанавіў на агульным зборы вылучыць некалькі піонэраў для распаўсюджваньня сярод мацярок часопісі „Беларуская Работніца і Сялянка“.

Працу ўжо распачалі. Распаўсюджана ўжо 85 экзэмпляраў часопісі.

Лічым гэтую працу вельмі карыснай і выклікаем іншыя атрады пасьледваць нашаму прыкладу.

Піонэры.

Будзем з часопісьсю.

Каб больш ведаць аб жыцьці і працы работніц і сялянак СССР і замежных краін, жанчыны калгасу „Савецкая Беларусь“ 8 сакавіка пастанавілі падпісацца ўсім на год на часопісь „Беларуская Работніца і Сялянка“.

Для збору падпіскі на часопісь вылучаны ўпаўнаважаныя. Вылучаныя таварышы абышлі ўсе дворы і сабралі падпіску.

Мы выклікаем на соцспаборніцтва па збору падпіскі на часопісь усе вёскі нашага Заборскага сельсавету. **Д. П.**

Чытачкі часопісі просяць рэдакцыю ў далейшым зьмяшчаць наступныя матар'ялы:

1. Гадаваньне дзяцей (аб гэтым ужо друкавалася, але мала).
2. Папярэджаньне цяжарнасьці (на вялікі жаль гэтага ў часопісі няма, а ўсіх цікавіць гэта пытаньне).
3. Кухня—стравы з гародніны і садавіны, іх значнасьць. Карысна зьмяшчаць рэцэпты рабкорак.
4. Вельмі карысна, каб на старонках часопісі сялькоркі дзяліліся, як праходзіць калектывізацыя, як арганізавана праца ў калгасе, як жывецца ў калгасах.

Трэба адзначыць, што гэта пытаньне самае жыцьцёвае і ім сялянкі цікавяцца больш усяго.

Зьмяшчаючы прапановы чытачак рэдакцыя прымае іх пад увагу і просіць усіх чытачак прысылаць свае прапановы аб часопісі, якія матар'ялы іх найбольш цікавяць, на якія пытаньні жадаюць атрымаць адказ праз часопісь.

ШТО ЗРОБЛЕНА ПА ДОПІСАХ РАБСЕЛЬКОРАК

Зьнялі з працы абслугоўваючы пэрсанал, распусьцілі мясцком

Расьсьледаваньне допісу, надрукаванага ў „Беларускай Работніцы і Сялянцы“ пад назвай: „Як працуе сталоўка,“—паказала правільнасьць азначаных у допісу фактаў. Сапраўды, у сталоўцы мелася сямейственасьць, сувязь з нэпманамі, абслугоўваньне клясава-чужых элемэнтаў, склочнасьць, антысанітарнае становішча. Райком партыі Пралетарскай слабады, Віцебскай акругі, паведаміў нас, што ў выніку расьсьледаваньня допісу зьняты з працы абслугоўваючы пэрсанал сталоўкі, загадчыца сталоўкі Ленцава прыцягваецца да партыйнай адказнасьці, пераабраны мясцком сталоўкі.

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

№ 10 || ОРГАН АДДЗЕЛУ РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК ЦК КП(б)Б || Красавік, 1930 г.

Праверым работу дэлегацкіх сходаў

Батрачкі і бяднячкі праз групы беднаты і дэлегацкія сходы павінны прыцягнуць масу сераднячак да актыўнага ўдзелу ў калектывізацыі. Ажывіць работу дэлегатак. Абвясьціць сацыялістычнае спаборніцтва паміж дэлегацкімі сходамі.

Сельская гаспадарка нашай краіны хутка перабудоўваецца на сацыялістычны лад. Значны лік бядняцка-серадняцкіх гаспадарак Беларусі вайшло ў калгасы.

Суцэльная калектывізацыя і на падставе яе праводзячаяся ліквідацыя кулацтва як класы адбываюцца ва ўмовах абвостранай класавай барацьбы. Таму ў сучасны момант перад намі стаяць надзвычайна складаныя задачы.

Аснаўной задачай зьяўляецца зараз замацаваць ужо арганізаваныя калгасы: наладзіць вытворчасьць, арганізаваць правільна працу і аплату працы колгасьнікаў. Праводзячы далейшую калектывізацыю бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, не вайшоўшых яшчэ ў калгасы, рашуча змагацца з скрыўленьнямі партыйнай лініі ў калгасным будаўніцтве, якое перашкаджае пасьпяховаму стварэньню калгасаў.

Усё гэта патрабуе яшчэ большага згуртаваньня батрацка-бядняцкіх мас і ўзмацненьня працы груп беднаты.

Для пасьпяховага выкананьня гэтых задач неабходна ўзмацніць работу дэлегацкіх сходаў у колгасах і на вёсцы.

Усе мы добра ведаем, што кулак шалёна супраціўляецца суцэльнай калектывізацыі і раскулачваньню, што кулак пускае ў ход усю сваю зброю для таго, каб пашкодзіць калгаснаму будаўніцтву.

Мы маем рад зьвестак аб тым, што ў асобных месцах пад уплывам кулакоў бяднячкі і сераднячкі зрывалі сходы, на якіх абгаварвалася пытаньне аб калгасе. А калі высьветлялася прычына, па якой жанчыны так супярэчылі калектывізацыі, дык выкрывалася, што прычына гэтага—кулацкая работа.

Кулак скарыстоўвае несьвядомасьць, няпісьменнасьць жанчын, нагаварвае ім розныя байкі аб тым, што калгасьнікаў будуць клеймаваць, што ў калгасе будуць сядзець бяз хлеба і іншую хлусьню.

У апошні час мы маем выпадкі, калі кулак падгаварвае выступіць супроць калгасу бяднячку, нават батрачку:—„Ты несьвядомая, табе нічога ня будзе, а мне прыдзецца адказваць".

Ня рэдка пры такіх выступленьнях жанчын за іх сьпінаю хаваецца кулак альбо поп.

Для таго, каб пасьпяхова разгортваць калектывізацыю і гаспадарча замацаваць існуючыя калгасы, **неабходна дабіцца, каб шырокія масы батрачак, бяднячак і сераднячак актыўна ўдзельнічалі ў стварэньні калгасаў і наладжваньні ў іх агульнай працы.**

За гэта павінны ўзяцца дэлегацкія жаночыя сходы. **Батрачкі і бяднячкі ў калгасах і на вёсцы павінны быць тымі арганізатарамі, якія аб'яднаюць** масу сераднячак для выкананьня нашых асноўных задач.

Ці дастаткова зараз дапамагаюць дэлегацкія сходы ў правядзеньні важнейшай работы па калектывізацыі, па арганізацыі працы ў калгасах, па правядзеньні пасеўнай кампаніі?

Рад зьвестак, якія мы маем, сьведчаць аб тым, што ў шэрагу месц дэлегацкія сходы не працуюць, а таму зразумела і не аказваюць належнага ўплыву на бядняцка-серадняцкіх жанчын, якія спрабуе кулак з'агітаваць супроць калгасу.

Вось, што піша работніца-брыгадзірка аб працы дэлегацкага сходу ў кусьце калгасаў „Красін" і „Чырвоны Працаўнік"—„работа пастаўлена дрэнна, вялікі ўплыў на дэлегатак маюць сэктанты".

У калгасе „Дзяржынскага", Клічаўскага раёну дэлегацкі сход да студзеня месяца зьбіраўся толькі адзін раз.

У Харлапавічах Бабруйскага раёну дэлегацкі сход зусім не працуе.

Між тым дэлегацкія сходы, якія згуртоўваюць батрачак, бяднячак і актыў сераднячак, павінны зараз асабліва шырока разгарнуць сваю работу для таго, каб сапраўды прыцягнуць жаночыя масы да вырашэньня стаячых перад намі задач.

Батрачкі і бяднячкі павінны быць актыўнымі ўдзельнікамі калгаснага будаўніцтва і рашуча змагацца з усякімі спробамі кулака скарыстаць масу сераднячак і асобных бяднячак для выступленьняў супроць калгасу. Праз групы беднаты і дэлегацкія сходы батрачкі і бяднячкі павінны павесьці за сабой серадняцкую масу жанчын, якая часьцяком хістаецца, якая ня можа яшчэ адразу канчаткова пераканацца ў перавазе каляктыўнай працы.

Што канкрэтна павінны рабіць зараз дэлегацкія сходы ў калгасах і на вёсцы?

У першую чаргу—дапамагчы пасьпяхова правесьці пасеўную кампанію. Мы павінны пашырыць пасеўную плошчу зьверх пляну на 12 проц. і мы гэта выканаем. Дэлегаткі павінны дапамагчы калгасу арганізавана выйсьці ў поле. Бяднячкі і ба-

ГПБ Ср. Ав.

трачкі павінны змагацца з фактамі разбору абагуленага насеньня і коняй, якія меліся ў асобных месцах з боку несьвядомых жанчын.

Для таго, каб дапамагчы ўзьняць гаспадарку калгасу, дэлегаткі павінны арганізоўваць брыгады калгасьніц па дагляду жывёлы, па засеву гародаў, кармавых расьлін, тэхнічных культур, асабліва бульбы і ільну. Дэлегаткі павінны дапамагчы правесьці новы статут сельгасарцелі, разьмеркаваць працу паміж калгасьнікаў, устанавіць правільную аплату працы.

Дэлегаткі павінны быць пачынальнікамі ў арганізацыі ясьляў і іншых бытавых устаноў у калгасах.

Батрачкі і биднячкі павінны актыўна ўдзельнічаць у рабоце груп беднаты, бо толькі ўзмацняючы арганізаванасьць батрацтва, беднаты і блок іх з серадняцтвам мы можам замацаваць калгасы і даць па



Ударнікі калгасу „Інтэрнацыянал", Койданаўскага раёну.

руках кулаку, які імкнецца пралезьці ў калгас і разбураць яго ці асабіста, ці праз сваіх прыхільнікаў.

Батрачкі і биднячкі павінны бязьлітасна ўскрываць жанчын кулачак і падкулачніц, якія нярэдка зьяўляюцца штурхачамі выступленьняў сераднячак супроць калгасаў.

Батрачкі і биднячкі-дэлегаткі павінны прылажыць усе свае сілы, каб аказаць уплыў у справе ўцягненьня ў калгасы бядняцка-серадняцкіх жанчын вёскі.

Дэлегаткі-калгасьніцы павінны актыўна змагацца супроць кулацкай хлусьні на калгасы, даводзячы прыкладам сваёй працы перавагу калгасу для жанчын, не ўвайшоўшых у каляктывы. Калгасьніцы павінны дапамагчы дэлегаткам вёскі ў правядзеньні пасеўнай кампаніі, растлумачваючы ім карысьць агульнага засеву палёў і гародаў.

Дэлегаткі, як перадавая арганізаваная частка жанчын, могуць і павінны дапамагчы той вялікай рабоце, якая зараз праводзіцца.

Трэба праверыць работу дэлегацкіх сходаў.

Мы прапануем правесьці зараз масавую праверку работы дэлегацкіх сходаў.

Батрачкі і биднячкі павінны дапамагчы партячэйцы высьветліць, **ці не пралезьлі ў дэлегаткі кулачкі, якія імкнуцца павесьці за сабой больш адсталую частку дэлегатак,** бо такім „дэлегаткам" ня месца ў дэлегацкім сходзе, іх трэба выгнаць з складу дэлегатак.

Работу дэлегацкіх сходаў трэба ажывіць, марудносьць, мярцьвячыну—трэба канчаткова выжыць.

Работу дэлегацкіх сходаў трэба накіраваць на выкананьне баявых задач па правядзеньню пасеўнай кампаніі і калякты візацыі.

Абвясьцім шырокае сацспаборніцтва на лепшую работу дэлегацкіх сходаў, на ўдзел дэлегатак у пасеўнай кампаніі, ва ўдарных брыгадах.

РАБСЯЛЬКОРКІ ПІШУЦЬ

Дэлегаткі першымі

У чэрвені дэлегаткі прынялі актыўны ўдзел у зборы каштоўнасьцяй у фонд індустрыялізацыі. Пасьля дакладу аб індустрыялізацыі краіны дэлегаткі зараз-жа сталі прыносіць залатыя рэчы ў фонд індустрыялізацыі. Акрамя гэтага дэлегаткі арганізавалі ўдарную групу па зборы каштоўнасьцяй з 15 чалавек, якія сабралі 250 грам золата, і кілё срэбра і каля 100 пудоў медзі.

Актыўны ўдзел у гэтай працы праявілі калгасьніцы Чарная Г. і іншыя дэлегаткі.

Сьледуйце нашаму прыкладу.

А. Грыбанава.

Чэрвень, Менскай акр.

Абвясьцілі сябе ўдарнымі

У Міжнародны Жаночы Камуністычны Дзень — 8 сакавіка на агульным сходзе савгасу „Серп" (м. Сьмілавічы) абвясьцілі сябе ўдарніцамі 5 работніц: Шахлевіч Волька, Кардаш Ларыса, Вярыга Ніна, Шабанова Мар'я і Хільманюк Л.

Шмат уступіла ў грамадзкія арганізацыі: у Мопр—21 жанчына, у чырвоны крыж—12, у Асоавіахім—5, у Бязбожнік—3.

Сярод жанчын савгасу „Серп і Молат" ударніцамі быў праведзены збор, на пабудову трактара імя „Беларускай Работніцы і Сялянкі", сабрана—4 руб. 30 кап.

Ударніцамі—Шахлевіч і Шабанавай сабрана на трактар сярод жанчын в. Жураўкавічы 3 р. 79 к.

Праведзена падпіска на часопісь „Беларуская Работніца і Сялянка" на 17 экзэмпляраў.

М. Шкадзюк.

Сьмілавічы, Менск. акр.

Дапамагаем ясьлям

Зараз па Брагінскаму раёну працуе 6 гурткоў кройкі і шыцьця. 4 з іх у калгасах. У гуртках наладжаны політгутаркі.

Сябры гуртка шылі вопратку для кутка „Маці і дзіця", а зараз узяліся за пашыцьцё бялізны для дзіцячых летніх ясьляў.

Г.

К веснавой сяўбе

У Дукорскім калгасе імя „16 Партызан" перачышчана ўсё насеньне, абагулены сельска-гаспадарчы інвентар і рабочая жывёла. Для працы жанчыны падзелены на групы па спэцыяльнасьцям: хто для працы на полі, хто ў сад, да кароў.

Жанчыны гэтага калгасу зьбіраюць попел для ўгнаеньня.

Пісарчык Г.

Дукора, Сьмілавіцкі р-н.

Рыхтуйцеся да першай гадавіны сацспаборніцтва

29-га красавіка 1930 г. адбудзецца першая гадавіна правядзеньня вялікага пачыну Ленінскага камсамолу—сацыялістычнага спаборніцтва.

За кароткі тэрмін сацспаборніцтва ахапіла фабрыкі, заводы, майстэрні, будоўлі, савгасы, установы, пачынае пранікаць у калгасы, у вёску.

Усё больш растуць шэрагі перадавікоў сацспаборніцтва—ударнікаў. Ад маленькіх групак—ударніцтва выросла ў масавы рух рабочых і работніц. Калі ў восень мінулага году па ўсёй Беларусі налічвалася каля 6.000 ударнікаў, што складала 3% да ўсіх рабочых, дык зараз ужо ўдарнікі складаюць 55% да ўсіх рабочых і колькасьць ударнікаў усё ўзрастае. Ужо маецца больш 50-ці ўдарных прадпрыемстваў.

Рабочыя, якія ўдзельнічаюць у правядзеньні сацспаборніцтва, і асабліва ўдарнікі,—паказваюць лепшыя прыклады адносін да працы на пралетарскіх прадпрыемствах, лепшых адносін да машын, варштатаў, матар'ялаў. падымаюць прадукцыйнасьць працы, выконваюць прамфінплян — правадзяць упарта і энэргічна сацыялістычны наступ.



Любінская—р-ца зав. „Энэргія" робіць часткі для сарціроўкі.

За месяц да гадавіны сацспаборніцтва пачынаецца падрыхтоўка даяго, як шырокая масавая праверка выкананьняў дагавароў па сацспаборніцтву.

Што трэба выявіць у час праверкі?

Неабходна выявіць і шырока папулярызаваць працу лепшых прадпрыемстваў, цэхаў, брыгад і лепшых ударнікаў. Вывучыць і шырока распаўсюдзіць вопыт іх працы. Заносіць на чырвоную дошку. Прэміраваць. Дабіцца, каб добрыя прыклады працы пачалі ўжывацца па ўсім прадпрыемствам, цэхам і брыгадам.

Адначасова з гэтым трэба выявіць усіх ілжэўдарнікаў. Маецца амаль, што па ўсім прадпрыемствам, шэраг прагульшчыкаў, п'яніц, рвачэй, якія пасьпяшылі прыкрыцца званьнем ударніка і зусім не палепшылі сваёй працы, працягваюць падрываць працдысцыпліну, пагоршваюць якасьць прадукцыі і брудзяць гэтым сваё званьне ўдарнікаў. Некаторыя прадпрыемствы на славах абвясьцілі сябе ўдарнымі, але не палепшылі сваю працу, ня выконваюць прамфінплян. Усё гэта павінна быць выяўлена ў час праверкі: недастойных трэба пазбавіць званьня ўдарнікаў. Трэба давесьці, што званьне ўдарніка—ганаровае званьне, якое неабходна заваяваць працай, справай.

Неабходна праверыць выкананьне дагавароў па сацыялістычнаму спаборніцтву ня толькі з боку работніц і рабочых, але і гаспадарнікамі. Ці здолелі гаспадарнікі давесьці плян прадпрыемства да цэху і варштатаў, ці наладзілі яны правільнае кіраўніцтва цэхамі, як хутка выконваюцца прапановы рабочых аб палепшаньні вытворчасьці, ці аказваецца дапамога ўдарным брыгадам, вынаходцам, вылучэнцам з рабочых і работніц.

Асабліва ўважліва трэба праверыць, як наладжана кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарнікамі, выгвор-

Вытворчая камуна швэйнай ф-кі „Кастрычнік".

чымі нарадамі, якія павінны стаць штабамі кіраўніцтва сацыялістычнага спаборніцтва. кіруюць фабзаўкомы справай сацспаборніцтва.

ЦК УсеКП(б) яшчэ ў студзені месяцы сказаў, што камуністы павінны пагалоўна ўдзельнічаць ва ўдарных брыгадах і паказваць прыклад лепшай працы, перад усімі рабочымі і работніцамі.

Яшчэ дагэтуль сацыялістычнае спаборніцтва паміж калгасамі і паміж прадпрыемствамі і калгасамі, разгорнута зусім мала, слаба разгорнута ўдарніцтва, маючыйся невялікі вопыт гэтай працы мала выяўлен. Неабходна ў сувязі з гадавінай шырэй разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва ў калгасах і вёсцы, перанесьці вопыт фабрык і заводаў у вёску, зрабіўшы сацыялістычнае спаборніцтва, штодзенным мэтадам працы ў калгасах і вёсцы, вагаром перабудовы вёскі на сацыялістычных пачатках.

Падрыхтоўка да гадавіны сацспаборніцтва, якая праводзіцца з першага красавіка па першае мая,—будзе праводзіцца як шырокая масавая кампанія. Таму асабліва патрэбна, каб у гэтай працы прынялі самы актыўны ўдзел масы работніц і калгасьніц, батрачак і бяднячак, у першую чаргу актыў, камуністкі, камсамолкі, дэлегаткі, лепшыя ўдарніцы.

Дагэтуль удзельная вага работніц ва ўдарных брыгадах была значнай. Калі на сотню рабочых мужчын маецца 52 ударнікі, дык на сотню работніц маецца 56 ударніц. Неабходна яшчэ больш павялічыць удзел работніц ва ўдарных брыгадах і палепшыць якасьць іх працы. Уцягнуць у шэрагі ўдарнікаў масы калгасьніц.

Правядзеньне масавай праверкі сацыялістычных дагавароў з шырокім удзелам рабочых, работніц, калгасьнікаў і калгасьніц, пасьпяховае правядзеньне гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва дапаможа яшчэ больш паглыбіць і распаўсюдзіць сацыялістычнае спаборніцтва як новую форму сацыялістычнай працы.

М. Шапіра.

Каму патрэбен вялікдзень?

Вялікдзень лічыцца веруючымі самым вялікім сьвятам—„праздников праздник“, як называюць яго папы.

Па рэлігійным павер'ям у гэтыя дні нібы васкрос хрысьціянскі бог, прыняўшы выгляд чалавека—Ісуса хрыста.

Навука доўгі час вывучала, ці быў сапраўды хрыстос, аб якім гаварылася ў евангэльлі і давяла, што ніякага хрыста ніколі ня было. К гэтаму вываду прышлі нават шэраг буржуазных вучоных.

Адкуль-жа ўзялося сьвята вялікдзень?

Навука высьветліла, што гэта сьвята, а таксама байка аб хрысьце была ня толькі ў хрысьціян, але ў цэлага раду народаў былі такія-ж байкі аб існаваньні розных „прарокаў“.

Байка аб хрысьце зарадзілася ў часы рабства, дзьве тысячы гадоў таму назад. Іудзея, у якой жылі тады яўрэі, была пераможана Рымскай імпэрыяй і насельніцтва ператворана ў рабоў. Цяжкае становішча рабоў прывяло да веры ў хрыста-бога.

Рабы ня верылі ў свае сілы, не бачылі збаўленьня і адсюль нарадзілася вера, што прыдзе „спасіцель-месія“, які вызваліць народ ад рабскага ўціску. Але „спасіцель“ ня прыходзіў і паступова пачала ўмацоўвацца чутка, што ён калісьці раней прыходзіў, тварыў цуды, але багачы яго расьпялі, ён васкрос і ўзьнёсься на неба.

Хутка нібы ён зноў прыдзе і тады ўжо канчаткова выратуе людзей, а пакуль трэба цярпець, пераносіць пакуту, як пакутаваў хрыстос.

Гэта вера паступова распаўсюджвалася і так складалася хрысьціянская рэлігія.

Гэта вера рабоў была карысна пануючай клясе, бо рэлігія вучыць цярпець і пакарацца: „Рабы, павінуйцеся сваім гаспадам“.—Зразумела, што эксплёататарам лягчэй было эксплёатаваць, пакорлівых, церпялівых рабоў. Гэтым і тлумачыцца, што цары і пануючыя клясы ахвотна прымалі хрысьціянства і распаўсюджвалі хрысьціянскую веру сярод прыгнечаных.

Чаму-ж гэта дзікунская вера ўжываецца і да нашых дзён?

Эксплёататары на працягу стагодзьдзяў падтрымоўвалі рэлігію і царкву, бо з дапамогаю рэлігіі і папоў яны маглі ашукваць працоўныя масы, каб яшчэ больш іх эксплёатаваць. Рознымі рэлігійнымі казкамі аб „царстве нябесным“, аб „пасьмертным жыцьці“, аб тым, што нібы „вярблюду лягчэй прайсьці праз вушко голкі, чым багатаму ў царства нябеснае“ **яны аддягвалі працоўных ад клясавай барацьбы.**

Буржуазія капіталістычных краін зараз асабліва падтрымоўвае рэлігійнасьць мас, бо клясавыя супярэчнасьці ўсё больш абвастраюцца і буржуазія скарыстоўвае рэлігію, каб замазваць гэтыя супярэчнасьці. Буржуазія капіталістычных краін з дапамогаю царквы імкнецца натравіць працоўных у новую бойку супроць СССР, для гэтага духавенства і буржуазія і крычаць аб ўціску рэлігіі ў Савецкім Саюзе.

У нашай краіне кулакі і нэпманы з дапамогаю рэлігіі імкнуцца натравіць адсталыя пласты працоўных, асабліва жанчын,—супроць мерапрыемств партыі і Савецкай улады.

Ласьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва нашай краіны, масавая калектывізацыя і на падставе яе ліквідацыя кулацтва як класы—праходзяць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. Кулацтва, адчуваючы сваю хуткую пагібель, супраціўляецца сацыялістычнаму наступленьню ўсімі сродкамі: падпальвае калгасы, забіваючы актывістых, агіднымі чуткамі запалохваючы няпісьменных жанчын супроць калгасаў. Кулаку ў гэтым дапамагае поп, які з дапамогаю рэлігіі імкнецца натравіць працоўных супроць савецкае ўлады.

Зразумела, што **клясавыя ворагі як ніколі будуць выкарыстоўваць вялікдзень, агітуючы супроць калектывізацыі, непрарыўкі і ўсіх нашых мерапрыемств.**

Яўрэйскі вялікдзень ня менш шкодны, чым хрысьціянскі вялікдзень, бо равіны ў гэты дзень будуць вучыць веруючых працоўных яўрэяў любіць сваіх ворагаў, толькі таму, што яны таксама яўрэі.

Працоўным яўрэям вельмі шкодны равінскія байкі аб „прыходзе месіі“, аб „Абетаванай зямлі“, бо іх сапраўднай бацькаўшчынай зьяўляецца толькі Савецкі Саюз.

Вялікдзень звычайна выкарыстоўваецца духавенствам для расьпяканьня нацыянальнай варожасьці між працоўнымі.

Папы, ксяндзы і кулакі прапагандаю антысэмітызму імкнуцца ўнесьці раскол у шэрагі працоўных. У змаганьні-ж з будаўніцтвам сацыялізму ў нашай краіне яўрэйскія равіны яднаюцца з папамі, ксяндзамі і сэктанцкімі прапаведнікамі.

Папы называюць вялікдзень сьвятам міру, любві і яднаньня ўсіх людзей.

Гэтым яны хочуць прымусіць, каб рабочы любіў капіталіста, які эксплёатуе працоўных, каб батрак і бядняк любіў кулака, які нажываецца на яго мазалёх. Рабскае сьвята—вялікдзень патрэбна толькі нашаму клясаваму ворагу. Вялікдзень—сьвята капіталістых, сэктантаў, кулакоў і папоў усіх колераў. Таму сьвядомыя працоўныя масы павінны ня толькі не сьвяткаваць вялікдзень, але рашуча змагацца за канчатковае вырыванье з-пад рэлігійнага ўплыву адсталай часткі працоўных, большасьць з якіх зьяўляюцца жанчыны.

Работніцы, жонкі рабочых, батрачкі, калгасьніцы, бяднячкі і сераднячкі павінны актыўна змагацца супроць рэлігійных баек, за стварэньне новага бязбожнага быту, уступаць у шэрагі ваяўнічых бязбожнікаў.

Вялікдзень—перашкода сацыялістычнаму будаўніцтву. Зробім вялікдзень працоўным днём.

Яшчэ больш узмацнім сацыялістычнае будаўніцтва нашай краіны, абарону СССР, абароназдольнасьць Чырвонай арміі.

Выканайце наша патрабаваньне.

Фабрыка „Чырвоны Тэкстыльшчык“ ня можа, як сьлед, разгарнуць культмасавую працу, бо няма памяшканьня.

Гурткі туляюцца ў маленькім габінэце дырэктара.

Пры заключэньні сацумовы з войлачнай фабрыкай мы зьвярнуліся з хадайніцтвам к Гарсавету даць нам пад клюб адну з сінагог. Трэба выканаць гэта патрабаваньне рабочых. **Завялевіч.**

Савгасьніцы ў першыя рады па веснавой сяўбе

Важнейшая задача, якая перад намі стаіць у справе далейшай пасьпяховай перабудовы сельскай гаспадаркі і замацаваньня калгаснага будаўніцтва, зьяўляецца пасьпяховае правядзеньне пасеўнай кампаніі.

Для правядзеньня яе неабходна мабілізаваць актыўнасьць шырокіх колаў работніц, батрачак і калгасьніц.

Кожная работніца, батрачка і калгасьніца павінна ўцяміць грамадную адказнасьць, якая на яе ўскладаецца ў сувязі з вясеньнім севам і памятаць, што для таго, каб правесьці яго з посьпехам неабходна напружаньне ўсіх нашых сіл. **Неабходна арганізаваць спэцыяльныя жаночыя брыгады ўдарніц і сацспаборніцтва паміж групамі работніц, калгасьніц і батрачак па ачыстцы насеньня, рамонту інвэнтару, транспарту і зброі, па збору ўгнаеньня, а таксама арганізаваць сацспаборніцтва з суседнімі савгасамі і калгасамі.**

Асаблівая роля належыць савгасьніцам, бо савгасы павінны быць прыкладам для калгасаў і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у пастаноўцы гаспадаркі і правядзеньні сяўбы.

Што-ж павінны рабіць савгасьніцы?

1. Праверыць, ці складзены пляны правядзеньня пасеўкампаніі, пляны вытворчых нарад у час пасеўкампаніі і як яны выконваюцца.

2. Праверыць, ці адрамантаваны сельска-гаспадарчы інвэнтар, машыны, трактары і г. д.

3. Як забясьпечаны савгасы насеньнем, ці ачышчана яно, колькі не ачышчана і колькі не хапае. Паставіць праз вытворчую нараду пытаньне аб атрыманьні нехапаючай колькасьці насеньня з належных месц і да ачысткі ва ўдарным парадку таго, што яшчэ не перачышчына.

4. Праверыць наяўнасьць угнаеньняў у савгасе, абгаварыць на вытворчай нарадзе, якім чынам мэтазгодна яго скарыстаць і высьветліць магчымасьці для павялічэньня колькасьці ўгнаеньня.

5. Высьветліць, за лік чаго савгас пашырае пасеўклін і што зроблена для пашырэньня пасеўнай плошчы.

Работніцы савгасаў павінны актыўна ўдзельнічаць у той рабоце, якая праводзіцца савгасам па дапамозе ў правядзеньні веснавой сяўбы ў калгасах: выезды савгаскіх брыгад у калгасы, па ачыстцы насеньня, рамонту інвэнтару і транспарту калгасаў.

Усебеларускія курсы птушкаводаў.

Работніца савгасу табельшчык за працай на полі.

Савгасьніцы павінны дапамагчы калгасам у справе арганізацыі бытавых і культурных устаноў: дзіцячыя ясьлі, інтэрнаты для батрачак-калгасьніц, клюбы, хаты-чытальні і г. д.

Дапамагчы арганізаваць у калгасах работу вытворчых нарад: па правядзеньню пляну вясеньняй пасеўкампаніі, арганізацыі працы і скарыстаньні рабочай і цягавай сілы ў час пасеўкампаніі, мерапрыемствы па палепшаньню жывёлагадоўлі і кармленьня, скарыстаньне ўгнаеньня.

Савгасьніцы, як частка арганізаванай рабочай клясы, павінны разгарнуць работу сярод бяднячак і сераднячак акаляючых вёсак, растлумачваючы ім карысьць каляктыўнай працы, разаблачаючы байкі кулацтва пра калгасы, дапамагаючы ляпей арганізаваць сваю працу да вясеньняга севу шляхам сацспаборніцтва. Асаблівую ўвагу неабходна ўдзяліць прыцягненьню батрачак і бяднячак да работы груп беднаты.

Да вясеньняй сяўбы засталося некалькі дзён. Праверым нашу гатоўнасьць да сяўбы! **Маслава.**

На грамадзкую працу.

Пры перавыбарах КСУ у Замшынскім сельсавеце, Віцебскай акругі старшыней КСУ аднагалосна абрана камсамолка-бяднячка Лісіцына.

Трэба ёй дапамагчы ў працы.

Менск. **С. К. Сярдзюкоў.**

КАЛГАС ІМ. „ЛЕНІНА“

Яшчэ ў мінулым годзе арганізаваўся ў вёсцы Зачысьці невялікі калгас Справа выйшла так.

Задумалі мясцовыя ўласьнікі паравога млыну і лесапілкі абмануць Савецкую ўладу і схаваць сваю ўласнасьць пад шыльдаю калгасу. Падгаварылі і рабочых млыну, дагаварыліся з аграномам, і прыступілі да афармленьня калгасу.

Але тут усё і сарвалася. Калі падрыхтоўчую працу яны маглі весьці тайна, так, што нават і мясцовая партячэйка ня ведала, то афармляць калгас прышлося на сходзе.

калгас. Мясцовая партячэйка і камсамольская разам з брыгадзірамі растлумачвалі важнасьць аб'яднаньня сялянскіх гаспадарак.

Некаторыя беднякі і сераднякі адразу падтрымалі, а другія выступалі супроць. Пасьля некалькіх сходаў шмат праціўнікаў сталі актыўнымі дапаможнікамі калектывізацыі. Адзін за адным пачалі падаваць заявы у колгас. Хутка ўсе беднякі і сераднякі вёскі запісаліся; з 115 працоўных гаспадарак, толькі 7 не ўвайшло ў калгас.

Далучыліся і 15 гаспадарак з хутараў Казлы-Макавье, давыбралі



У калгас імя Дзяржынскага. Гомельская акр.—вывозяць гной на поле.

Прысутнічаўшая тут бедната і інструктар Акругкому партыі, выкрылі гэты нібы-калгас, не дапусьцілі прыняць у яго чужды элемэнт.

У працівес гэтаму нібы калгасу бедната разам з некаторымі серадняками стварылі свой калгас. Запісалася 16 гаспадароў.

Пасьля склад іх крыху зьмяніўся. Хістаючыяся вышлі, прышлі новыя і ў час асеньняга севу было 18 гаспадарак у калгасе. Правялі зямляўпарадкаваньне.

Калгас атрымаў 350 гэктараў зямлі. Дружна і энэргічна працавалі. Засеялі жыта, засадзілі фруктовы сад. Патроху прыбывалі новыя калгасьнікі. Нарэшце сабралося 30 гаспарак.

Прышоў 1930 год. У Зачысьці пачалі гаварыць аб суцэльнай калектывізацыі сельсавету. Амаль штодзенна былі сходы. Яшчэ перад агульным сходам на дзьвух жаночых дэлегацкіх сходах абгаварвалася пытаньне аб калектывізацыі. Амаль усе дэлегаткі запісаліся у савет калгасу, сярод іх адну дэлегатку-бядначку.

Як падрыхтаваны колгас да веснавой сяўбы?

Амаль закончана абагуленьне насеньня. Але перачыстка насеньня праведзена толькі на 60%. Не сьпяшаюцца з такой тэрміновай працай, а пасеў на насу. Зусім не абагулена рабочая жывёла. Няма яшчэ ў калгасе точнага разьмеркаваньня работы.

Для рамонту інвэнтару пабудавалі калгасьнікі кузьню, пасадзілі туды сваіх кавалёў-калгасьнікаў. Пачаўся рамонт інвэнтару.

Калгасу перадалі паравы млын і лесапілку. Па дагавору з Барысаўскім Камбінатам расьпілілі і вывезлі 2 вагоны дошак.

Зарабіў калгас 1.400 рублёў. Вывезьлі калгасьнікі і свой будаўнічы лес.

Пры прызначэньні на работу праявіліся хістаньне. Некаторыя не пайшлі і гаварылі другім: „Дурань, нашто ты ідзеш, ня ідзі“.

Рашыў савет калгасу, што гэта нікуды ня варта. З гэткімі калгас не пабудуеш. Разам з беднатой і серадняцкім актывам парашылі выкінуць з калгасу тых, хто парушае дысцыпліну і агітуе іншых, нават з паўдарогі варочае ўжо выехаўшых на работу. Выключылі 10 чалавек. Тады толькі некаторыя з іх адумаліся, прышлі прасіць зноў прыняць іх. Сталі акуратна выяжджаць на работу, разам з усімі калгасьнікамі.

Ёсьць пакуль сярод некаторых калгасьнікаў хістаньні, некаторыя паддаюцца чуткам, якія распускаюць на вёсцы кулакі, што нібы ўлада супроць калектывізацыі, а яе хочуць толькі мясцовыя работнікі.

Шмат яшчэ рознай хлусьні распаўсюджваюць кулакі, карыстаючыся цемраю і няпісьменнасьцю некаторых сялян.

Але ў працівес ім маецца ў калгасе даволі моцны актыў, які групуецца вакол партячэйкі і групы беднаты.

Актывістыя-калгасьнікі на сваім сходзе ўсе як адзін заяўляюць: „Нам патрэбна ня колькасьць, а якасьць калгасьнікаў, хай усе тыя, хто хістаецца, скажа, хоча ці ня хоча ён быць у калгасе“.

Аб настроях беднаты сьведчыць 1 тое, што 15 калгасьнікаў ужо ўліліся ў шэрагі партыі, з іх адна дэлегатка.

У мясцовай ячэйцы маюцца яшчэ заявы аб прыёме ў партыю.

Гэта сьведчыць аб тым, што калгасная гаспадарка бязумоўна будзе наладжана.

У гэтым годзе калгасам намечана будаўніцтва двара для жывёлы, якое павінна быць скончана да восені, але ніяк ня можа савет калгасу дабіцца ад Акркалгассаюзу пляну скотнага двара. Нарочна ў Менск за гэтым езьдзілі, а там усё абяцаюць прыслаць і ня шлюць.

Даў калгас і задатак—800 рублёў на трактар.

Райвыканкомам у хуткім часе адчыняюцца ў калгасе летнія яслі.

Майскай.

в. Зачысьце, Барысаўскага р-ну, калгас імя „Леніна“.

Рэдакцыя чакае ад калгасьніц водгукаў, як вы праводзіце вясновую сяўбу. Ці абагулілі вы рабочых коняй, ці складзены ў вас ударныя брыгады.

У аламутнай вадзе

(Аканчаньне)

Апавяданьне Галкі

малюнкі Вяло

VII

Ніхто дакладна ня ведаў дню, у які павінна прыехаць камуністка-аграномка. І калі супроць савгаскіх варот спынілася хурманка балаголы, насустрач ёй ня выйшаў ніводзін чалавек.

Яшчэ зусім маладая жанчына выскачыла з возу, расплацілася, струсіла з сябе салому і, падхапіўшы клунак, пашла ў кантору.

У канторы было ціха, за сталом сядзеў толькі адзін Ламака. Ён так углыбіўся ў паперы, што нават ня скмеціў, не падняў вачэй насустрач прыежджай.

А жанчына пакаўзнулася вачыма па пакоі, і, як толькі намацала Ягора Барысавіча, у вачох яе загарэліся агеньчыкі. Яна ўпілася ў яго постаць.

— Няўжо я памылілася,—пра сябе прашаптала яна.

Яшчэ пільней яна ўглядзелася ў Ламаку, затрымала вочы на чорнай тасёмцы і. хістануўшыся, абаперлася аб вушак.

— Так, так, ня можа быць памылкі. І тасёмка гэта...

За дзьвярыма пачуліся галасы, а сьледам, некалькі дзяўчат убегла ў кантору.

— Ганну выклікаюць на нараду, мы прышлі паведаміць з вечару—пачала Антося, але ўбачыўшы прыежджую, кінулася да яе.

— Антося, ты тут?

— Я чакала цябе. Адразу падумала, калі пачула прозьвішча—адказала Антося.

— Але чаго мы стаім тут? Хадзем да мяне, прыладзіш рэчы, адпачнеш з дарогі,—жвава загаварыла Антося і, абняўшы прыежджую, яны выйшлі з канторы.

— Антося, хто гэты чалавек, што ў канторы сядзіць?

— Гэта Ягор Барысавіч,—кіраўнік нашага савгасу. Ты гаварыла з ім? Якое ўражаньне?

* * *

У гэты вечар не палілі агню ў хаце Антосі. Гутарылі ў поцемках.

А ў поўнач, калі стомленая падарожжам таварышка Антосі, заснула, Антося ўстала ціханька з ложка, апранулася, прашаптала: „Казаў з Чырвонай арміі дэмабілізаваўся“—і вышла за дзьверы.

Ноч цёплая, перадвясеньняя. Антося-ж сьціскала сківіцы, каб не ляскалі зубы. Яе мардавала некае незнаёмае калаценьне.

Цёмнымі скрынкамі выглядалі будынкі, толькі дзе-ні-дзе ў вокнах блішчэў агеньчык. Слабы сьвет відаць было з канторы і кватэры Ламакі.

Антося пастукала ў дзьверы.

Ніхто не адгукнуўся. Яна пацягнула клямку. Дзьверы не замкнуты. У лямпе выкручаны невялічкі агонь. Відаць, гаспадар кватэры вышаў некуды толькі на хвілінку.

Антося пераступіла парог. Проста перад ёю стаяў стол, за які калісьці яна пасварылася з Ламакай. Дзяўчына скмеціла, што ў адной з шухлядак стырчыць забыты ключ.

На момант замяўшыся, яна падышла да стала, нэрвова-дрыжачаю рукою адцягнула шухлядку.

Чаго шукала Антося, яна і сама добра таго не ўяўляла. Рука сама коўзалася і намацаўшы нешта, выцягнула яго, то быў звычайны, абшарпаны бумажнік.

Антося разгарнула яго, зазірнула ў адно, другое аддзяленьне. Бумажнік быў пусты. Дзяўчына хацела яго ўжо кінуць назад, у стол, але скмеціла з самай баковачкі стырчаў ражок белай паперы. Выцягнула просты канвэрт, запусьціла руку ў яго і зіхнула.

За дзьвярыма пачуліся крокі.

Укінуўшы ў кішэню бумажнік, Антося засунала шухлядку, адышла ад стала.

Вайшоў Ламака.

— Так позна? Навіна!.. Але сядай, сядяй,—запрасіў ён,—я вельмі рады.

— Бачыш, якая ўзаемнасьць,—аўладаўшы сабою адказала Антося:—учора табе нецярпіма была самота, а сёньне мусібыць мы памяняліся.

— Пройдземся, пагуляем—прапанавала яна памаўчаўшы.

Ламака ня спускаў вачэй з дзяўчыны, уважліва сачыў за кожным яе рухам.

— Як ты надумалася ў такі позьні час да мяне прысьці?

... Няўжо я памылілася?

— А ты можа не рады?.. Я прынесла адказ на тваю прапанову. Але цябе не застала і пакуль дачакалася—страціла словы.

— Не жартуй, любая, я вышаў у кантору.

— Сапраўды нудна ў хаце. А табе, ня нудна?—запытала дзяўчына.—Пройдземся і не спыняючыся дадала:

— Ня хочаш? Я сама пайду.

Ламака ўставіўся вачыма ў яе. Неспадзяванай загадкай для яго быў прыход дзяўчыны. Але вось губы яго скрывіліся. Ён падумаў:

„Сапраўды прышла мабыць з адказам на прапанову".

— Ты апранутая? Была недзе? Чаго ты ўсхвалёвана так?

Антося дастала з кішэні бумажнік, моўчкі падала яго таварышцы.

Тая разгарнула яго, вытрусіла ўсё, паднесла к вачам ў чацьвёра складзеную пісульку. Заглянуўшы ў яе, Антося пазнала, што пісалася рукою Ламакі. Анэля прачытала ўголас:

„Аляксандр, ураджай—у трубе. Рыба—плавае недзе. Лістэцкі—уліп. Я пакуль застаюся, невядома дакуль затрымаюся. Прыходзіцца сьцішыць ход".

Перакінуўшы яшчэ некалькі паперак, узяла ў рукі канвэрт. З паперы на жанчын паглядаў рослы, малады ахвіцэр. У ім Антося пазнала Ламаку.

... Гэта ён, той самы...

Ён працягнуў руку, каб зьняць паліто.

— Ха-ха-ха,—пачуў ён незразумелы сьмех.—Ты думаў я сапраўды зьбіраюся на шпацар зараз?

— Антося, якая ты дзіўная сёньне. Ты чамусьці нэрвуешся?

Але дзяўчына была ўжо за дзьвярыма.

Заціпаючы дыханьне яна бегла к дому. Убегшы ў хату, яна кінулася да ложка, дзе спала таварышка, абедзьвюма рукамі пачала штурхаць яе.

— Анэля, прачніся, уставай!

Анэля расплюшчыла вочы. Яе зьдзівіў выгляд зьбялелай дзяўчыны, з валасамі раскіданымі па твары.

Антося засьвяціла агонь.

У Анэлі ў вушах загрымелі снарады. Перад ёю ўсплыў бліндаж, хлеў, гарод, акрываўлены сьнег, чырвонаармеец, чарнявы ахвіцэр, з адрубаным вухам і кіраўнік савгасу з чорнай тасемкай, абняўшай твар.

Згінаючы ў руце фатаграфію Анэля ціха прагаварыла:

— Я не памылілася—гэта ён, той самы ахвіцэр, што ў мяне на вачох шабляю зарубіў чырвонаармейца.

* * *

Увечары рабфакаўцы шумліва рассыпаліся па агульнажыцьці: падзакусіць, а там—хто за кніжку, а хто—на адпачынак.

— Антося цябе сёньне некалькі разоў пытала прыежджая жанчына,—даганяючы у даужэнным калідоры паведаміла дзяўчыне таварышка.

„Хто б гэта?"—падумала Антося і ўбачыўшы сьвятло ў шкляным версе дзьвярэй убегла ў пакой.

— Анэля, вось нечакала!

— Здаровенька, рабфакаўка. Ты хоць павярніся, дай аглядзець з усіх бакоў, чым зьмянілася ў горадзе,—пажартавала Анэля.

— Ты ў нутро загляні, у мазгі,—усьміхнулася ў адказ дзяўчына.

— Позна заняткі ў вас.

— Грызем.

— Цяжка? Стамляешся?

— А што табе казаць пра гэта. Сама нядаўна ад кніжкі, ведаеш.

— Так, і мне здаецца ўсё, што ўчора над кніжкаю сядзела. А сапраўды—2 гады, як лёду. А якія годы. Зроблена за іх, жыцьцё пасуналася як за добрых дзесяць год—задумана прагаварыла Анэля.

— Столькі зьмен, столькі працы, цяжкай, вялікай!

Адкрыта кажучы табе, пасяброўскі, я вельмі ня ўпэўнена, бралася за кіраўніцтва савгасам, тады як арыштавалі Ламаку, выкрылі іх шкодніцкую хэўру.

І ня толькі атрыманыя ў акадэміі веды мне паддалі столькі сьмеласьці. Галоўнае—я ўбачыла адданасьць гаспадарцы ў саміх рабочых.

Эх, Антоська, якая незьмярымая адданасьць!

Першай-жа вясною, мы сьледу не пакінулі часавому заняпаду: дагналі і перагналі страчанае.

Зараз сэрцу цесна ў грудзях, калі пазіраем на ўраджаі, нашы новыя пруды. А пастаноўку рыбнай справы нават з далёку прыяжджалі да нас вывучаць, а зараз мяркуецца ў нас арганізаваць рыбаводны тэхнікум.

— Чаму ня пісалі мне пра гэта?—пакрыўдзілася Антося.

Слухаючы таварышку, дзяўчына разам з ёю захаплялася створаным, зусім забыла пра рабфак. Яна ўяўляла возера, пруды, палі савгасу і мілых родных сябраў па працы. Кожны куточак гаспадаркі здаваўся такім блізкім, дарагім—часткаю яе самой,—Антосі.

Анэля-ж працягвала:

— Год страчаны. З болем вялікім ўспамінаюць аб ім рабочыя. Але ўсё-ж выкрылі мы шкоднікаў, не даўшы досыць разгарнуць, а ня толькі выканаць іх злачынны плян.

Ты ведаеш, Антося, столькі грошай меркавалася ўкласьці ў новыя пруды! І...

Анэля запнулася. Пасьля працягвала:

— У бяздоньне. „Балотца“-ж пагубіла-б усе сродкі, а яны хацелі зрабіць яго галоўным гняздом.

Зусім у новым месцы мы зрабілі пруды—пановавыпрацаванаму пляну.

Ты толькі ўяві сколькі сродкаў хацелі ўтапіць шкоднікі ў каламутнай вадзе.

Змоўклі таварышкі. Прытуліўшыся адна да аднэй яны сядзелі, усёй глыбінёю сваёй адчувалі адну справу, запаланіла іх адна думка.

Анэля парушыла цішыню.

— Я зусім забыла. Табе ўсе нашы даручылі гарачае прывітаньне перадаць. Запрашаюць прыехаць на летнія вакацыі, кажуць: „Скажы, каб ня цуралася. Мы выправілі яе на вучобу, хай веды да нас нясе“.

— Я і сама-б жадала, але ў савгас я зьвярнуся, вядома, а зараз у калгас куды-небудзь.

Антося—глянула на стол, і толькі зараз скмеціла пісьмо да яе.

Пасьпешна адкрыла яго, прачытала бегла.

— Анэля, якая-ж ты, і ўсе вы!.. Здаецца недалёка я, а вы зусім адкінулі мяне, не гаворыце, аб вашых галоўных посьпехах.

— Аб чым ты?

— На, паглядзі.

Антося падала таварышцы лісток паперы, у якім Кастусь так скончыў пісьмо:

„Прыяжджай. А пакуль—пішы. Толькі адрас мой зараз новы: Калгас „Полымя“ былая вёска Грудок“.

— Вёска—былое. Сучаснасьць—новы калгас „Полымя“,—прагаварыла дзяўчына і ў захапленьні моцна абняла Анэлю.

КАЛГАСЬНІЦЫ ПІШУЦЬ

Арганізуем быт

К дню 8 сакавіка ў нас у камуне было адчыненьне агульнай сталоўкі. У гэты дзень зьехаліся сялянкі акаляючых вёсак, каб паглядзець нашу сталоўку. Сялянкі зьехаліся таму, што кулакі распусьцілі чуткі па вёскам—нібы ў агульных сталоўках даюць есьці з аднаго катла, з якога адразу ядзяць усе 60 камунараў, і таму заўсёды застаюцца галоднымі.

Але, агледзеўшы нашу сталоўку, сялянкі пераканаліся, што гэтыя чуткі ёсьць хлусьня кулацкая, а сапраўды ў сталоўцы кожнаму даюць есьці з асобнай талеркі, абед з 2—3 страў, у сталоўцы галоднымі не застаюцца.

Сялянкі пераканаліся, што толькі каляктыўная гаспадарка, арганізаванае агульнае харчаваньне і дзіцячыя ясьлі могуць разьняволіць жанчыну ад бясконцай і малакарыснай тупаніны.

Самі камунары і камунаркі таксама здаволены тым, што адчынілася сталоўка, цяпер стварыліся добрыя ўмовы камунаркам выйсьці на працу ў поле і наогул працаваць у гаспадарцы разам з камунарамі. **Хацінская.**

Камуна „Мір“, Сеньненскага р-ну, Віцебскай акругі.

Гіне ўгнаеньне

У калгасе „Перамога“ да гэтага часу яшчэ ня вылучаны брыгады па збору попелу, а попел высыпаецца на вуліцу, ці на загуменьне, бо калгасьніцы ня ведаюць, што гэта гіне добрае ўгнаеньне.

Трэба, каб ні адзін хунт попелу дарэмна ня гінуў. А для гэтага трэба дэлегаткам вылучыць брыгаду па збору попелу.

Забаўскі.

Дукора.

Арганізавалі чырвоны абоз ільну і лому

З чырвоным сьцягам прыбыў у Марына-Горскую Спажыўкааперацыю чырвоны абоз Леццоўскага дэлегацкага сходу, які сдаў 600 кілё ільну-валакну і 800 кілё лому.

Трэба, каб усе дэлегацкія сходы Пухавіцкага раёну ўзялі прыклад з Леццоўскага дэлегацкага сходу ў дапамозе нарыхтоўцы ільну і лому.

Слаўковіч.

Пухавіцкі р-н.

Работа сярод работніц павінна быць работай усёй партарганізацыі

(Барысаў).

Фабрыка „Чырвоная Бярэзіна“ і „Пралетарская Перамога“ маюць большасьць работніц.

Работа сярод работніц павінна быць справай усяго парткаляктыву і фабкому. Але пералому ў гэтым пакуль няма. У сувязі з ліквідацыяй спэцыяльнага работніка сярод работніц, бюро парткаляктыву ня ўцяміла, як гэту работу зрабіць агульна-партыйнай.

Правядзеньне 8 сакавіка аб гэтым яскрава сьведчыць. Урачысты сход, прызначаны на 6 гадзін, у новым клюбе хэмікаў, пачаўся ў 11-ай гадзіне. Работніц было вельмі мала, амаль адсутнічалі старыя кадравыя работніцы. Жанарганізатар тав. Жукоўская (сябра ЦВК БССР) не зьявілася, каб адчыніць і правесьці сход. Яна, бачыце, два дні таму назад была аслабанена як платны жанарганізатар і пагэтаму парашыла, што гэта не яе справа.

Ячэйкі таксама не падрыхтаваліся к таму, каб скарыстаць 8 сакавіка для ўздыму якасьці ўдарнай работы работніц, для ўцягненьня лепшых старых работніц у партыю.

А як абстаіць справа з вылучэньнем работніц?

За ўвесь час вылучана 20 работніц, частка з іх прыёмшчыцамі і загадчыцамі цэхаў. Замест таго, каб прывучыць іх быць добрымі адміністратарамі і кіраўнікамі вытворчых цахоў іх апекаюць па дробязям і гэта апека ўплывае так, што таварышы не адчуваюць дастатковай адказнасьці за выкананьне прамфінпляну ў цаху.

Прамфінпляну ў цаху няма. Роля работніц, загадчыц цэхамі—гэта быць наглядчыкамі і то дрэннымі. Так, напрыклад: у зьёмальным і каробачным цэхах новай фабрыкі „Пралетарская Перамога“, работніцы вельмі дрэнна сачаць за якасьцю выпрабляемай прадукцыі, шмат браку. Тут-як быццам павінна сябе праявіць загадчыца цэхам, вылучэнка, работніца, каб зьнішчыць гэтае зьявішча. Але гэтага няма.

Вылучэнкі баяцца спрачацца з работніцамі, папусьціцельствуюць. Дакладваюць загадчыку вытворчасьцю аб гэтым, і ўсё.

Сваіх правоў і абавязкаў у сувязі з правядзеньнем адзінаначалія загадчыкі цахамі ня ведаюць.

А калі заглянуць у зьёмальнае аддзяленьне старой фабрыкі, за некаторы час да гудку, дык жудасна робіцца. Вось, што можна было наглядаць 13 сакавіка ў дняўной зьмене:

Хвілін за 30—40 да гудка пачалася шалёная атака варштатаў з рамамі.

Шмат добрых запалак рассыпаных на падлозе, тапталі нагамі. Каля саміх варштатаў таўхатня, неразьбярыха. Загадчык цэхам стаіць і рукамі разводзіць, лічыць гэта звычайнай справай—„17 год працую на фабрыцы і заўсёды ў нас так. Гэта зьнішчыць—нельга“.

Гэта „дробязь“ моцна дэзарганізуе вытворчасьць.

А цяпер паглядзім на іншых вылучэнак.

На „Бярэзіне“ рашылі, што кожнае перасоўваньне работніц—ёсьць вылучэньне.

Чым тлумачыць тое, што работніцы накіраваныя на работу ў ЦРК прыказчыцамі залічаны ў сьпіс вылучэнак? Няўжо-ж думалі, што зьняць работніцу з варштату і накіраваць за прылавак ёсьць вылучэньне работніцы на кіруючую работу? Гэта ўсё насьмешка над самым сэнсам вылучэньня.



Ударніцы „Чырвонай Бярэзіны“.

Альбо яшчэ факт: дзьвух камсамолак-работніц „вылучылі“ кандуктарамі ў аўтобус.

Бюро парткаляктыву таксама відавочна прыняла ў сур'ёз гэта вылучэньне, і вынесла суровы пратэст супроць работнікаў ЦРК, якія дрэнна прынялі вылучаных работніц, прапанаваўшы ім прыці мыць падлогу ў краме.

А вось вылучыць работніцу намесьнікам дырэктара—ніяк не зьбяруцца. Некалі. Ня гледзячы на дзьве пастановы аб гэтым РК, ніхто з фабрычных арганізацый аб гэтым ня думае. Людзі патрэбны да зарэзу, месца пустуе, набор і падрыхтоўка кваліфікаванай рабочай сілы ідзе дрэнна.

Наогул **з вылучэньнем работніц абстаіць справа дрэнна.** Склалася такое становішча, што работніц вылучаюць, а потым задзьвігаюць, як гэта было з некалькімі работніцамі (Шанчыц, Мархель Надзя, Патаповіч і іншыя).

З культурна-бытавым абслугоўваньнем работніц таксама справа абстаіць ня зусім добра. **Лікбез амаль разваліўся** У апошнія дні магчыма было наглядаць на старай фабрыцы, што прыходзяць тры настаўнікі і не застаюць ніводнага няпісьменнага. Відавочна трэба фабкому ўзяцца за гэту справу мацней, таму што няпісьменных на фабрыцы некалькі соцень чалавек.

Яслі і ачаг ня могуць задаволіць запатрабаваньняў работніц. Штодзенна наглядаецца шмат прагулаў работніц праз дзяцей. Далі грошы на пашырэньне яслянаў і ачагу, але ніхто яшчэ з фабрычных арганізацый добра ня ведае, колькі і дзе будзе будавацца альбо пашыраць дзіцячых установаў, а будаўнічы сэзон на насу.

Зусім адсутнічае работа з ударніцамі. Шмат работніц ня ўцягнуты ва ўдарныя брыгады. На фабрыцы каля 1.400 работніц, а ва ўдарныя брыгады ўцягнуты 934 жанчыны.

Шмат **ударніц** робяць **прагулы**, спазьняюцца на работу, парушаюць унутраны распарадак і гэтак далей. Партячэйкі і цэхпрафбюро не ўзяліся яшчэ як належыць за гэту работу сярод работніц, як з аснаўной масай на фабрыцы.

Патрэбна зараз-жа на справе перабудаваць работу сярод работніц так, каб не адыгрывацца па старынцы на жанарганізатары.

Пры парткаляктыве няма жаночага сэктару—гэта значыцца, што адпаведныя сэктары парткаляктыву, цэхячэек, фабкому і цэхпрафбюро павінны ўключыць у сваю штодзеінную работу і гэту частку работы сярод работніц.

Камуністкі і жаночы актыў фабрыкі павінны дапамагчы партыйнай і прафэсыйнай арганізацыям асвоіць у практычнай рабоце асобыя формы і мэтады работы сярод работніц, якія ў большай сваёй частцы застаюцца ранейшымі (дэлегацкія сходы, сходы работніц, бытавыя пытаньні і гэтак далей), тады магчыма будзе гаварыць аб выкананьні дырэктывы партыі, аб рабоце сярод жанчын.

І. Б.

Андрэй Бязьмежны

Камсамольскі нядзельнік

Заірдзеў агнём усход і захад,
Зазірнуў з-за лесу ясны дзень...
І плыве чырвонакрылай птахай
Сонца ў высь, наўкола паглядзець.

Весялей сырэны загудзелі,
Прыгажэй усё на небе зацьвіло;—
Камсамолкі выйшлі на нядзельнік,
На завод:—зьбіраць жалезны лом.

Мітусяцца ў завадзкіх завулках...
Эх, братва, пільней глядзі ў куткі!
А пад крык раскацісты і гулкі
На грудзёх агнём іскрыцца „КІМ“.

Эй, братва, давай на перагонкі,
Тэкля, Ганка, дружна, не адстань!
Ад таго і дзень сягодня звонкі,
Над зямлёю крыльлі распластаў.

Кожны твар расквечаны вясьнянкай
Нястрымана радасны ўздым;
Колы, рэйкі, старыя балванкі,
Падбірай, ды складвай у груды.

Заіскрацца домны нясупынна,
Толькі больш у горла ежы сып.
Будуць з лому новыя машыны,
Выкуюць заводы карпусы.

Застракоча, забуяніць трактар,
На прывольлі зруйнаваных меж,
І пад гул і сталёвыя такты,
Час ляціць і вокам ня зьмігнеш.

Весялей сырэны прагудзелі,
Старым дням пайшлі наперакор,
Бо сягоньня выйшлі на нядзельнік,
Камсамольцы: даць заводам корм.

Косы дню электрай дагарэлі,—
Дагарэла дзённая краса,
Шызакрылы вечар акварэллю
Неба край у чырвань расьпісаў.

Задрыжэў у пералівах захад,
Адпачыць прылёг стамлёны дзень,
Выплывае срэбнакрылай птахай,
Маладзік наўкола паглядзець.

Сёньне ў хаце нам уседзець цесна,
Бо ў працы—радасьць і сьвятло.
Ударым дружна з пералівам песьню
Пра нядзельнік і жалезны лом.

„На збор жалезнага лому,
Выходзь усе як адзін.—
Сотням заводаў і домнаў,
Чорную ежу дадзім.

12

К агляду грамадзкага харчаваньня

У бліжэйшы час па Беларусі пачынаецца агляд грамадзкага харчаваньня, які праводзіцца Цэнтральным Саветам Прафсаюзаў і газэтай „Зьвязда".

Грамадзкае харчаваньне зараз набывае асабліва важнае значэньне, як наогул у справе палепшаньня дабрабыту рабочых мас, так і асабліва ў справе разьнявольваньня работніцы-ўдарніцы ад хатняй непрадукцыйнай працы па варцы яды для сябе і сваёй сям'і. Правільна пастаўленае грамадзкае харчаваньне садзейнічае ўздыму вытворчасьці працы і дае вольны час работніцы для вучобы і грамадзкай працы.

Між тым у пастаноўцы грамадзкага харчаваньня мы маем шэраг недахопаў.

Значны лік сталовак не прыстасаваны для абслугоўваньня рабочага спажыўца: чаргі, дрэннае санітарна-гігіенічнае становішча сталовак, нездавальняючая якасьць абедаў, слабая праца каапэрацыйных сталовых камісій і г. д.

Агляд, які зараз праводзіцца, павінен выявіць усе гэтыя недахопы і дапамагчы палепшыць становішча грамадзкага харчаваньня. Работніцы і жонкі рабочых павінны актыўна ўдзельнічаць у пасьпяховым правядзеньні агляду, бо жанчына заўсёды лепш ведае недахопы ў пастаноўцы грамадзкага харчаваньня, і асабліва зацікаўлена ў далейшым пашырэньні грамадзкага харчаваньня.

Актыўна ўдзельнічаючы ў брыгадах па агляду, работніцы павінны высьвятляць усе заўважаныя імі недахопы і ўнасіць свае прапановы аб тым, як палепшыць працу сталовак, як зрабіць больш таннымі адпускаемыя абеды і палепшыць іх якасьць. Як зьнішчыць чаргі, як палепшыць абслугоўваньне наведвальнікаў.

У першую чаргу ў аглядзе павінны ўдзельнічаць **рабкоркі**. Яны змогуць аказаць значную дапамогу ў выкрываньні недахопаў у сталоўках.

Мы маем ўжо прыклады. Наша рабкорка работніца фабрыкі „Дзьвіна" ў Віцебску паведаміла нас аб тым, што дрэнна працуе сталоўка пры фабрыцы, а калі допіс быў расьсьледаван, дык высьветлілася шэраг хваробных зьявішч: сувязь з клясава-чуждым элемэнтам, злаўжываньне, склочніцтва. Допіс рабкоркі дапамог аздараўленьню сталоўкі.

Усе маючыяся ў грамадзкім харчаваньні недахопы работніцы павінны высьветліць у час агляду.

Ад рэдакцыі: З мэтай дапамогі ў разьвіцьці грамадзкага харчаваньня ў нашай часопісі будзе зьмешчаны рад гутарак і парад аб пастаноўцы агульных сталовак у калгасах і жактах.

Чытачкі, шлеце запытаньні аб грамадзкім харчаваньні, на якія вы жадаеце атрымаць адказ.

Пашырым будаўніцтва сталовак

Грамадзкае харчаваньне, правільна арганізаванае, адыгрывае значную ролю ў справе разьнявольваньня працоўнай жанчыны ад кухні для больш карыснай вытворчай і грамадзкай працы. Правільна пастаўленае грамадзкае харчаваньне дае таксама магчымасьць больш рацыянальна скарыстаць прадуктовыя фонды краіны.



Закладка фабрыкі-кухні у Менску.

Сучасная сетка сталовых: 62 у горадзе, 57 па вясковым мясцовасьцям, якая адпускае штодзенна 25 тысяч абедаў на ўсю БССР, нездавальняя нават самым мінімальным запатрабаваньням працоўных і патрабуе значнага павялічэньня.

У гэтым годзе ўжо прыступілі да пабудовы ў Менску буйнай фабрыкі-кухні, на 24 тысячы абедаў у дзень. Фабрыка-кухня вялікі крок да вызваленьня работніцы ад кухні. Закладка яе праведзена ў дзень 8 сакавіка.

Апрача фабрыкі па пляну намечаны 4 сталоўкі па 2 тысячы абедаў у Менску і Віцебску і цэлы рад больш дробных. Па калгасам і савгасам вызначана арганізаваць да 200 сталовак. Гэта зьяўляецца значным зрухам у справе калектывізацыі быту, але яшчэ вельмі недастатковым.

У справе далейшага разгортваньня грамадзкага харчаваньня павінна быць праяўлена шырокая самадзейнасьць. Работніцы і жонкі рабочых павінны паставіць сабе мэтай дабіцца арганізацыі сталовак пры жактах на самадзейных пачатках. Калгасьніцы павінны дабівацца арганізацыі калектыўнай сталоўкі ў сваім калгасе.

Каапэрацыя будзе дапамагаць арганізацыі гэтай справы, у набыцьці інвэнтару, абсталяваньні і снабжэньні. Арганізацыя на старонках часопісі „Работніца і Сялянка" кутка дапамогі ў арганізацыі сталоўкі пры жакце і калгасе вельмі патрэбна. На старонках часопісі практычныя работнікі ў гэтай галіне будуць даваць канкрэтныя парады, як гэту справу арганізаваць.

Мазлееў.

НЕДАХОПЫ ПАД АБСТРЭЛ

Незадкладна аздаравіць працу

(Пісьмо брыгадзіркі)

Калгас імя „Калініна“ трэба аздаравіць. Вось якое становішча ў калгасе:

Між калгасьнікамі няма згоджанасьці ў рабоце. Дысцыпліна адсутнічае, кожны робіць, што сам лічыць патрэбным.

П'янства сярод некаторых калгасьнікаў — звычайнае зьявішча. Калі выносяць вымову такому сябру калгасу, ён зьнімае шапку, з п'янай усьмешкай зьяўляе: „Сып, сып, я піў і піць буду, ня вы мне забароніце“.

Дзе-ж кіраўнікі гэтага калгасу і чым яны заняты?

Старшыня калгасу — Пяўцоў вельмі занят грамадзкай працай: ён сябра прэзыдыуму сельсавету, замяшчаў старшыню сельсавету. Ён-жа старшыня палявога таварыства.

Затое, аб становішчы калгасу, Пяўцоў заяўляе: „Гэта ўсё дробязь, аб якой ня варта клапаціцца“.

Пяўцоў патакае п'янству. На агульным сходзе калгасу Пяўцоў заявіў новаму старшыні кіраўніцтва калгасу: „Калі адмовішся ад чаркі будзеш дурань“.

Калгассаюз павінен больш заняцца ўнутраным становішчам калгасу.

Некалькі слоў аб Івольскім сельсавеце.

Івольскі сельсавет ніякай работы не праводзіць, а працаўнікі яго толькі п'янствуюць.

Кіраўнікі сельсавету і калгасу ўмела замазваюць свае ганебныя справы і гэтым ствараецца ў раённых установах няправільнае ўяўленьне аб сапраўднасьці.

Па настаяньню брыгады, якая там працавала,—сельсавет быў пераабраны. Але ў новы склад вайшлі тыя-ж п'яніцы, што і раней былі, а лепшыя кандыдатуры былі правалены.

Пры цяперашнім складзе сельсавету спадзявацца на палепшаньне працы нельга.

Настаўнік Навояў, ён-жа сябра сельсавету, п'е запоем.

Якую работу можа праводзіць ад'яўлены п'яніца?

Настаўніца — жонка Навоява, вельмі хоча працаваць, але яна супроць п'яніц і таму ад яе адмяжоўваюцца, к грамадзкай рабоце не дапускаюць.

Райком партыі заспакойвае сябе словамі: „Там усё добра“.

Вось як здолеў гурт п'яніц і падрыўшчыкаў работы, стварыць сабе аўтарытэт, што Райком і Райвыканком і Райкалгассаюз, у якога яны знаходзяцца пад носам, глыбока заспакоены былі і давяралі словам падманшчыкаў.

У Райкоме адчуваецца адзін толькі сэкратар тав. Шпак. Хоць у Райкоме ёсьць яшчэ агітпроп і жанарганізатар, але ніхто з іх у працы не адчуваецца.

Былі выпадкі, калі Шпак адсутнічаў і тады справа стаяла на месцы, чакаючы прыезду Шпака.

Вядома, т. Шпак ня можа адзін ахапіць усяе работы, а астатніх працаўнікоў не ўцягвае.

Брыгадзірка Шэрман.

Гомельская акруга.

Зьмяшчаючы допіс т. Шэрман рэдакцыя чакае слова Гомельскага Акругкому і Акркалгассаюзу аб тым, што зроблена для аздараўленьня работы ў сельсавеце, узмацненьня парткіраўніцтва колектывізацыяй, аздараўленьня ўнутранага становішча калгасу імя „Калініна“.

Пажадана таксама, каб калгасьніцы самі больш падрабязна асьвятлялі становішча калгасу і што зроблена на месцы для аздараўленьня працы.

Таранда „камандуе“

У Грабенцы, Чэрвеньскага раёну ёсьць Таранда—Старшыня сельска-гаспадарчага таварыства. Таранда лічыць сябе вялікім начальнікам і запалохвае акаляючае насельніцтва.

Лаянка — звычайная гаворка Таранды. Ён ня лічыць за сабою ніякіх недахопаў.

А недахопаў дык і вельмі многа.

Дэлегаткі сабраліся ў клюб на сход. Але Таранда быў „у дрэнным настроі“ (а ў добрым ён вельмі рэдка бывае) і таму пакінуў дэлегатак без сьвятла, узяўшы ад іх лямпу, а сам пайшоў дамоў.

Яшчэ неяк селянін вёскі Чарнаградзьдзі — Заголька, Мікола Андрэяў, бядняк, прышоў у сельсавет прасіць спраўку на атрыманьне матар'ялаў з каапэрацыі для пахаваньня памершага дзіцяці. Таранда і тут умяшаўся і забараніў справаводу Гаўрыленку выдаць спраўку, а прыкрыкнуў на Загольку:

„Няхай у цябе хоць 30 чалавек здохне—усё роўна нічога тзбе ня дам“.

8 сакавіка ў Міжнародны Камуністычны Дзень Жанчыны Таранда аблаяў дэлегатак, абазваў іх сволачамі і брадзягамі. Але ўсіх момантаў „начальстваваньня“ Таранды не пералічыш.

Заўважваць недахоп на месцы ніхто не адважыцца, бо за гэта ад Таранды мала ня будзе.

Чуўшы і бачыўшы.

Чэрвенскі р-н, Грабенскі с.-с. в. Чарнаградзьдзі.

Рэдакцыя чакае адказу Чэрвеньскага Райвыканкому, аб тым, што зроблена для разгортваньня здаровай самакрытыкі ў вёсцы Грабенцы, і якія захады ўжыты ў адносінах Таранды.

Павесьці рашучую барацьбу з скрыўленьнямі і перагібамі ў калгаснам будаўніцтве.

Старшыня скрыўляе лінію партыі

Старшыня камуны вёскі Сіпішчава Панкраценка Фама Рыгораў, калі абагульвалі жывёлу, у дакладзе сказаў: сёньня абагульваем кароў, а заўтра авечак, сьвіней, а потым начнем вопратку абагульваць. У гэтай-жа галавацяпскай прамове старшыня пашоў далей, сказаўшы: у каго маюцца грошы ў ашчаднай касе, то мы забярэм гэтыя грошы ў камуну. Такая адсябяціна кандыдата партыі ёсьць скрыўленьне лініі камуністычнай партыі.

Выступленьне старшыні падштурхнула некаторых калгасьнікаў к выхаду з камуны.

Таго, хто скрыўляе лінію партыі трэба прыцягнуць да адказнасьці.

Дубровеньскі р-н, Цілеўскага с/с.

Сялькорка.

Рэдакцыя чакае адказу Дубровеньскага Райкому КП (б) Б аб тым, што зроблена ў адносінах партыйцаў, якія груба скрыўлялі партыйную лінію.

ПАПРАЎКА.

У часопісі № 5—6 на 2-й ст. вокладкі ў артыкуле „6 сакавіка—дзень сумеснай барацьбы рабочых і беспрацоўных усяго сьвету“ ўкралася апячатка: у радку 10 зьверху надрукавана, у Польшчы 4 мільёны, трэба чытаць: у Польшчы 400 тысяч.

19

НАВУЧЫ НЯПІСЬМЕННУЮ

26 дзень: Матар'ял для гутаркі і чытаньня—часопісь №№ 7—8—9. Самастойнае чытаньне і сьпісваньне кароткіх карэспандэнцый „з пасеўнага фронту". Вылучэньне гуку літар „Ц і Ф".

Па матэматычнай грамаце—складаньне і адыманьне найменшых лікаў:

2 р. 12 к.
+4 р. 82 к. і інш. Запіс тэксту звычайнага рахунку.

26. Рабочая брыгада дапамагла

24 сакавіка ў калгас „Камунар" прыехала рабочая брыгада заводу „Камінтэрн". Яна адразу пачала работу шпаркім тэмпам. Пры дапамозе рабочай брыгады арганізавана група батрацтва і беднаты. Вытворчая нарада абмеркавала плян веснавой пасеўнай кампаніі. Парашылі пашырыць яравы клін і плошчу засеву кармавых траў. Абагулілі коняй, стварылі непарушны кармовы фонд. Закончылі ачыстку насеньня. Зрабілі вапнаваньне глебы. Разам з рабочай брыгадай праўленьне калгасу разьмеркавала калгасьнікаў па брыгадах на палявыя работы.

Адрамантавалі хурманку і збрую. Стварылі ўдарную брыгаду з 17 хурманак для вывазу гною. На 28 сакавіка парашылі зрабіць спробны выхад на поле. Ужо пачалі вывозіць гной. Пры дапамозе рабочай брыгады арганізавалі машынна-конную станцыю.

Калгас „Камунар" з посьпехам выконвае плян веснавой сяўбы.

Ц. ц. Ф. ф.

Мы за калгасы

Абвостраная клясавая барацьба, якая разгарнулася зараз вакол калектывізацыі, адлюстроўвалася ў прамовах дэлегатак канфэрэнцыі калгасьніц Шклоўскага раёну.

— Нас кулакі запалохвалі, што ў калгасах бяз хлеба падохнем. А я перш, чым уступіць у калгас, азнаёмілася з жыцьцём калгасу, створанага з батракоў, і ўбачыла, што адзіны правільны шлях разьвіцьця сельскай гаспадаркі—гэта калектывізацыя,—гаворыць калгасьніца.

Дабраўскія камунаркі і дэлегаткі яўрэйскага калгасу „Іскра" прыкладамі росту гаспадарак даводзілі карысьць каляктыўнай працы.

Рабочыя і работніцы ф-кі „Спартак" прыходзілі вітаць зьезд і прынясьлі залатыя рэчы ў падарунак на трактарную калёну. Пагутарыўшы, з рабочымі дэлегаткі заявілі:

— Пад кіраўніцтвам кампартыі з дапамогай рабочых, мы вёску перабудуем у суцэльны калгас.

— Я была супроць калгасу,—заявіла дэлегатка,—а зараз, калі ўбачыла, што з намі рабочыя, іду ў калгас, вяду ў калгас сваю жывёлу. Наперакор кулакам, якія нас угаварваюць не абагульваць жывёлу і насеньне.

— Мы супроць рэлігійнага дурману,—заявілі ўдзельніцы канфэрэнцыі. Рабочыя здаюць золата на трактарную калёну, а мы на гэту мэту здадзім званы, а царквы скарыстаем пад клюбы.

— Мы будзем будаваць калгасы, канчаткова перамагаючы кулака, адзінадушна заявіла канфэрэнцыя калгасьніц.

В.

Шклоў, Магілеўскай акр.

У „Лясной Паляне"

У 12-ці кілёмэтрах ад м-ка Багушэўка існуе калгас „Лясная Паляна". Ён арганізаваны ў 1928 г. З гаспадарчага боку калгас яшчэ слабы. Частая зьмена працаўнікоў у праўленьні калгасу мела дрэнны адбітак на гаспадарцы.

У калгасе 17 сямей, 85 едакоў, апрацоўваюць 226 *га* зямлі.

Жывёлагадоўля ў калгасе слаба пастаўлена, інвэнтару яшчэ мала ды і той дрэнна даглядаецца, так: З жалезных бараны ляжаць бяз догляду пад сьнегам. У лесанарыхтоўках калгасьнікі ня прымаюць удзелу, хаця калгас знаходзіцца ў лесе.

Культурная праца не вялася Мясцовыя арганізацыі таксама мала дапамагаюць у наладжваньні працы ў калгасе.

У сувязі з суцэльнай калектывізацыяй раёну Аршанскі Акругком прыслаў работніц у „Лясную Паляну".

Узяліся за наладжваньне працы.

Сход калгасьніц вынес пастанову арганізаваць чырвоны куток разгарнуць галосную чытку газэт, пачаць працу па ліквідацыі няпісьменнасьці, зарганізаваць гурткі.

Памяшканьне чырвонага кутка патрабавала абсталяваньня.

Раздабылі праз грамадзкія арганізацыі 35 рублёў.

Закіпела праца. Калгасьнікі пачалі стругаць сталы і лаўкі для чырвонага кутка.

Калгасьнікі паехалі ў лес для вывазкі дрэва.

Зараз у „Лясную Паляну" прысланы для працы, у якасьці старшыні калгасу—рабочы-вылучэнец, сябра партыі.

М. Завістоўская.

м. Багушэўскае.

Рэдакцыя чакае водгукаў ад калгасьніц „Лясная Паляна", як яны падрыхтаваліся да вясеньней пасяўной кампаніі.

Забясьпечым жывёлу кармамі

Прыбытковасьць гаспадаркі залежыць ад правільнай яе арганізацыі. Правільна арганізаваная гаспадарка дае прыбытак і разьвіваецца. Таму неабходна лепей арганізаваць гаспадарку калгасу.

Ва ўмовах Беларусі калектыўныя гаспадаркі павінны мець малочна-жывёлагадоўчы напрамак. Паляводзтва трэба арганізоўваць так, каб яно больш абслугоўвала жывёлагадоўлю.

У нашых умовах чым больш жывёлы, чым больш угнаеньня, значыцца, атрымоўваецца большы ўраджай і больш хлеба. Чым лепшая прадукцыйнасьць малочнай жывёлы, яе якасьць,—тым больш малака, масла, мяса. Чым больш сьвіней—тым больш сала. Значыцца, трэба імкнуцца к таму, каб у гаспадарцы было магчыма больш жывёлы, але да жывёлы патрэбен корм. Пагэтаму арганізацыя жывёлагадоўлі патрабуе ў першую чаргу арганізацыі кармавой базы.

Трэба будаваць каляктыўную гаспадарку так, каб усе кармы, атрымоўваемыя ў гаспадарцы пераапрацоўваліся як сыравіна ў болей каштоўныя прадукты жывёлагадоўлі ў самай гаспадарцы. Таксама неабходна пашырыць у калгасах засеў кармавых расьлін і загатоўку кармоў для жывёлы.

Неабходна арганізаваць так гаспадарку, каб жывёла была забясьпечана кармамі раўнамерна на працягу году, ад чаго і прадукцыйнасьць яе ня будзе выпадковай. Звычайна ў сялянскіх гаспадарках недахоп кармоў бывае ўвесну і калі зіма зацягваецца на два-тры тыдні, становішча жывёлы ствараецца катастрафічнае.

Увесну, калі асабліва патрэбны кармы—іх няма. У гэты час на пашах травы няма, жывёла павінна харчавацца дома, а харчавацца то няма чым. Вось чаму трэба арганізаваць кармавую базу, каб кармоў для жывёлы было дастаткова на працягу ўсяго году. Неабходна эканомна скарыстоўваць запасы



Калгасьніцы дояць кароў.

грубых кармоў на працягу зімы, таму, што грубыя кармы цалкам другімі кармамі замяніць нельга.

Для павялічэньня запасу грубых кармоў, як сена, саломы і іншых неабходна прыняць меры да ўздыму ўраджайнасьці нашых сенажацяй і палёй. Нашы сенажаці не даюць поўны ўраджай сена, бо за імі няма ніякага догляду. Самыя простыя меры догляду за сенажацьцю, як, напрыклад, баранаваньне, зрэзка кочак, зьнішчэньне кустарнікаў, асушка, могуць павысіць ўраджайнасьць значна. Гэтыя меры не патрабуюць вялікіх затрат, але даюць добрыя вынікі. Для павялічэньня колькасьці грубых кармоў неабходна заводзіць палявое травасеяньне—гэта значыць пасеў у полі клеверу, вікі, сэрадэлі і іншае.

Для забясьпечаньня сочнымі кармамі, неабходна ўводзіць на палёх засеў карняплодаў (буракоў, марковы, турнэпсу, бруквы). Сочныя кармы апрача таго, што даюць эканомію ў сене і саломе, яшчэ адрозьніваюцца малакагоннымі ўласьцівасьцямі.



Абагулены с.-гасп. інвэнтар.

Пры кармленьні карняплодамі ўдой кароў значна падвышаецца. Але гэтымі мерамі яшчэ ня вырашаецца кармовае пытаньне. Карняплоды, напрыклад, цяжка захаваць да вясны, і спажыўнасьць к вясьне гэтых кармоў зьніжаецца. Такім чынам вясною сочных кармоў можа і ня быць.

У гэты-ж час адчуваецца недахоп і ў грубых кармох. Вясною-ж целіцца вялікая частка кароў, якіх трэба добра карміць. Каб забясьпечыць гаспадарку сочнымі кармамі цалкам, неабходна мець так званы сіласаваны корм. На шырокае ўжываньне сіласаванага корму калгасы павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Сілос—гэта квашаны корм. Ён ідзе галоўным чынам для харчаваньня малочных кароў і можа замяніць зялёны пасьбішчны корм і карняплоды. Ён прыгодзен для ўсякага часу году, калі толькі падрыхтаваны добра.

Падрыхтоўваецца сіласаваны корм у асобных сілосных башнях альбо ямах, у якіх ён можа захавацца круглы год, і пры адсутнасьці другіх кармоў страхуе жывёлу ад бяскормiцы. Апрача таго, ён мае добры ўплыў на малочнасьць кароў, падвышае іх удой.

Калгасам неабходна зьвярнуць увагу на ўтрыманьне жывёлы ўлетку. Улетку жывёла харчуецца на пашы, падножным кормам. Добры пасьбішчны корм самы здаровы і найбольш спажыўны. Пагэтаму арганізацыя пасьбішча ў калгасе зьяўляецца неадкладнай справай. Правільна арганізаваная пасьбішчная гаспадарка—аснова прадукцыйнай жывёлагадоўлі і прыбытковай малочнай гаспадаркі.

На нашых пашах кустарнікі, кочкі, усялякая трава, асок і сарнікоў, мох і іншае. На такіх пашах самая лепшая малочная карова зробіцца дрэннай-навозьніцай.

Праўда адразу зрабіць нашы пашы ў добрыя нельга, але правесьці самыя простыя мерапрыемствы па палепшаньню іх—магчыма. Мерапрыемствы гэтыя тыя-ж, што і пры палепшаньні пашы: зрэзка кочак, зьнішчэньне кустоў і пнёў, баранаваньне, вапнаваньне, угнаеньне і іншае.

Усе гэтыя мерапрыемствы не патрабуюць вялікіх сродкаў, даюць добрыя вынікі. Але лепш усяго пачаць работу па закладцы ў гаспадарцы так званых штучных паш, калі вучасткі адведзеныя пад закладку штучных, паш, узворваюцца і засяваюцца шматлетнімі травамі. Такім чынам, каб у гаспадарцы трымаць найбольшую колькасьць жывёлы неабходна пры рашэньні кармовага пытаньня мець наступнае:

1) Прыняць усе захады для павялічэньня ў гаспадарцы грубых кармоў—шляхам палепшаньня паш і ўвядзеньня палявога травасеяньня.

2) Неабходна пашырыць да магчымых разьмераў засевы карняплодаў і клубняплодаў для корму жывёлы.

3) Для замены зялёных сочных кармоў і зьмяншэньня недахопаў у кармох вясною, неабходна шырока разгарнуць работу па закладцы ў калгасах сіласаў.

4) Неабходна прывесьці ў парадак летняе трыманьне жывёлы на пашах, арганізаваўшы пашу такім чынам, каб жывёла давала высокі ўдой, па магчымасьці бяз усякай падкормкі.

5) Неабходна арганізаваць так кармовую плошчу ў калгасе, каб усе кармы ўключаючы і моцныя, выраблялiся ў самой гаспадарцы.

Вось тыя асноўныя пытаньні па арганізацыі кармовой базы, якія неабходна вырашыць у калгасе ў першую чаргу.

В. Цітоў.

Яські ў калгасах

Сярод шэрагу мерапрыемств па аздараўленьню працы і быту працоўных жанчын адно з першых месц займае ахова мацярынства і младзенства. У царскай Расіі на кожныя 100 нарадзіўшыхся дзяцей умірала да году 30 дзяцей. Жудасная лічба!

Зусім іншае мы маем пры Савецкай уладзе.

У сучасны момант сьмяротнасьць дзяцей да году раўняецца 14-ці на сотню. Больш чым у два разы скарацілася дзіцячая сьмяротнасьць. Арганізацыя дзіцячых яськаў зьяўляецца аднэй з прычын, якая скарачае сьмяротнасьць дзяцей.



Маці, ідучы на работу пакідае сваё дзіця ў яськах ў вопытных руках, дзе яно апрача ўмелага, правільнага дагляду атрымоўвае яшчэ і належнае выхаваньне.

Калі цяжка, а інады і немагчыма было адчыняць яські ў вёсках з раскіданымі дробнымі гаспадаркамі, то больш лёгка і магчыма выканаць гэта ў буйных калгасах.

Яські вызваляюць калгасьніцу ад клопат з дзяцьмі і даюць ёй магчымасьць стаяць у рабоце на аднэй вышыні з мужчынаю. Ведаючы, што яе дзіця мае добры догляд, яна спакайней працуе і гэта павялічвае прадукцыйнасьць яе работы.

У раёнах суцэльнай калектывізацыі ў сучасны момант адчынены курсы па падрыхтоўцы ясельных сясьцёр. У Копыльскім раёне да 8 сакавіка адчынены курсы на 50 чалавек. Курсанткі гэтыя выключна батрачкі і бяднячкі, накіраваныя з калгасаў.

Лекцыі ім чытаюць урачы, практыку-ж і вопыт яны атрымоўваюць у раённай больніцы, кансультацыі, а таксама-ва ўзорных яськях, якія адчынены ў Копылі.

Ва ўсім раёне мяркуецца адчыніць каля 35 яськаў, частка якіх будзе працаваць круглы год.

Мацяркі-калгасьніцы, дапамагайце будаваць яські, будзьце штурхачамі ў гэтай справе, мабілізуйце грамадзкія сілы і сродкі на пабудову новых яськаў.

Урач Ф. Грынгольць.

Няма кіраўніцтва

У калгасе „Новы Шлях“ ужо больш як месяц арганізавана ячэйка „Прэч няпісьменнасьць“. Завербавана ў ячэйку 50 чалавек. Але ніхто ня склікаў сходу, ня даў напрамак у далейшай рабоце.

Калі ўступалі ў ячэйку, кожны браў на сябе абавязак навучыць дзьвюх няпісьменных, бо ў калгасе налічваецца 130 няпісьменных. З гэтага ліку ў сучасны момант лікпунктамі ахоплена 25 проц. Астатнія, у большасьці жанчыны, сядзяць яшчэ дома няпісьменныя.

Сьпічка.

Сьмілавіцкі р-н.

Беражы здароўе

Як зьберагчыся ад цяжарнасьці

Быць маткаю—асабістае шчасьце і вялікі грамадзкі абавязак жанчыны. Але часта выношваць, раджаць, карміць і выхоўваць дзяцей вельмі цяжка, асабліва для жанчын, якія працуюць на прадпрыемстве, удзельнічаюць ва ўсім гаспадарчым і грамадзкім жыцьці.

Акрамя гэтага вельмі частая цяжарнасьць, роды і кармленьне зьнясільвае жанчыну.

Таму жанчыны бываюць прымушаны штучна прарываць цяжарнасьць—гэта значыць рабіць аборт.

Але аборты, у асаблівасьці паўторныя шкодны для здароўя і нават небясьпечны для жыцьця.

І вось з даўніх пор вучоныя стараюцца знайсьці такія сродкі, якія маглі-б папярэдзіць цяжарнасьць. Такі сродак павінен быць ня шкодным для здароўя, надзейным, танным і даступным для шырокіх мас. Супроцьзародачных сродкаў маецца шмат, але ня ўсе яны надзейны і танны.

Шкодныя сродкі наступныя: 1) успрысківаньне, альбо нават змазваньне полаcьці маткі ёдам, такі сродак выклікае катар маткі, а інады і запаленьне труб і яічнікаў, што небясьпечна.

2) Мэталёвыя прозэрватывы, маючы від грыбка. Такі грыбок уводзіцца ў шыйку маткі і выклікае часта белі і язвы на шыйцы. Акрамя таго яго павінен ўводзіць кожны раз урач пасьля месячных і ўдаляць да месячных.

3) Няскончаны палавы акт—гэты спосаб надта распаўсюджан, але ён выклікае ў жанчын болі ў паясьніцы, альбо крэстцы і часта нэрвовае растройства.

Менш шкоднымі сродкамі лічацца: 1) Мужскі кандон, але ён часта парываецца, дорага каштуе і не дасягае мэты.

2) Улагалішчнае спрынцаваньне, мае той недахоп, што яно клапатліва і інады ня можа быць выканана, бо павінна быць зроблена адразу-ж пасьля палавых зносін. Але калі хочуць імі карыстацца, то вада павінна быць цёплая з дабаўленьнем дзьвюх лыжак дравеснага воцату і спрынцавацца трэба з кружкі „Эсмарха“, але не карыстацца гумавым балёнам, з якога вада выцякае пры выцісканьні рукою.

3) Ня раіцца ўжываньне губак, бо іх цяжка трымаць у чыстаце, ужо лепш карыстацца камком ваты, змочанай слабым хатнім воцатам. Ён кожны раз удаляецца і перад кожнымі зносінамі можна карыстацца сьвежай ватай.

У сучасны момант усе прышлі к заключэньню, што **самымі лепшымі супроцьзародкавымі сродкамі** трэба лічыць жаночы гумавы калпачок і ўлагалішчныя шарыкі. Для таго, каб карыстацца калпачком трэба накіравацца да ўрача, альбо ў кансультацыю для цяжарных. Там скажуць, які нумар калпачка трэба набыць, бо яны бываюць рознай велічыні, і навучаць, як трэба надзяваць і як удаляць. Насіць яго цэлы месяц шкодна, бо ён можа выклікаць белі.

Улагалішчныя шарыкі прадаюцца ў аптэцы пад назвай „Контрацэпцін“. За тры хвіліны да зносін уводзіцца ва ўлагалішча такі шарык, дзе ён ад цяплыні растваряецца.

Пры няправільным палажэньні маткі, шарыкі ненадзейны, а таму ўрач павінен рашыць, што для данай жанчыны больш падыходзіць: шарыкі альбо калпачок. Але памятаць трэба, што гэтыя сродкі могуць прадасьцярэгчы ад цяжарнасьці толькі на больш-менш доўгі тэрмін.

Дактар **М. Поляк.**

„Беларуская Работніца і Сялянка“

з студзеня 1930 году выходзіць 3 разы ў месяц.

Падпіску можна здаваць на пошту, лістаносцам, у кіёскі ці прысылаць непасрэдна ў рэдакцыю.

Часопіс каштуе— 1 месяц: . . . . 20 капеек | Паўгода. . . 1 р. 20 капеек
3 месяцы . . . 60 „ | Год . . . . 2 р. 40 „

Цана асобнага нумару 10 кап.

Упаўнаважаныя па падпісцы атрымоўваюць 10 проц. з сабранай сумы.
Кожная актывістка, грамадчыца, дэлегатка, работніца, калгасьніца, саўгасьніца, бяднячка і сераднячка—павінна чытаць сваю часопіс „БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА“.
Кожная актывістка павінна распаўсюджваць гэту часопіс.

Чытайце, распаўсюджвайце і пішэце ў сваю часопіс.

Адрас рэдакцыі: Менск, вул. Карла Маркса, 14, тэлефон—5-85.

ЦАНА АСОБН. НУМАРУ 10 кап.

СТАРОНКА РУЧНОЙ ПРАЦЫ



Вышываньне гладзьдзю.





Вышываньне крыжыкамі.

Выдавец—Аддзел работніц і сялянак ЦК КП(б)Б. *Рэдактары* { Н. Бурава. Г. Рагазіньнікава.

Друкарня БДР Заказ № 1579 У ліку 17.500 экз. Галоўлітбел № 857.